**Ёган Себасцьян Бах**

**ЦЯРПЕНЬНІ**
**ПАВОДЛЕ МАЦЬВЕЯ**
**BWV 244**
***Poesia Dominum Henrici***
***alias Picander dictus***

**Johann Sebastian Bach**

**MATTHÄUS-PASSION**
**BWV 244**
***Poesia Dominum Henrici***
***alias Picander dictus***

## 1 ЧАСТКА

### 1 № 1 Хор

ХОР I і II
Гляньце, сёстры мілажалю...
Вось ён!
Хто?
... Ягня, Хрыстос.
Гляньце, ён!
Хто?
... Жаніх зь нябёс!

CHORUS I u. II
Kommt, ihr Töchter, helft mir klagen...
Sehet!
Wen?
... den Bräutigam.
Sehet ihn!
Wie?
... als wie ein Lamm.

ХАРАЛ
О Сын Божы бязьвінны,
У цернях злое няпраўды.

CHORAL
O Lamm Gottes unschuldig
Am Stamm des Kreuzes geschlachtet.

ХОР I і II
Вось ён!
Хто?
Пакутнік Спас.

CHORUS I u. II
Sehet!
Was?
Seht die Geduld.

ХАРАЛ
На крыж прыбілі Сына, —
О, колькі вынес пагарды!

CHORAL
Allzeit erfund'n geduldig
Wiewohl du warest verachtet.

ХОР I і II
Глянь...
На што?
Ратуе нас;

CHORUS I u. II
Seht...
Wohin?
... auf unsre Schuld;

ХАРАЛ
За грэх наш пакараны,
За нас пакуты, раны.

CHORAL
All' Sünd hast du getragen,
Sonst müßten wir verzagen.

ХОР
За любоў сваю да нас
Крыж нясе, п'е мукаў шалю.

CHORUS
Sehet ihn aus Lieb und Huld
Holz zum Kreuze selber tragen.

ХАРАЛ
Акрый нас жалем, Ісусе!

CHORAL
Erbarm dich unser o Jesu!

KAMUNKAT.org

2 **№ 2**

ЕВАНГЕЛІСТ
Калі скончыў Ісус усе словы гэтыя, дык сказаў вучням Сваім:

EVANGELISTA
Da Jesus diese Rede vollendet hatte, sprach er zu seinen Jüngern:

ІСУС
Вы ведаеце, што праз два дні Пасха будзе, і Сын Чалавечы выдадзены будзе і асуджаны на ўкрыжаваньне.

JESUS
Ihr wisset, daß nach zweien Tagen Ostern wird, und des Menschen Sohn wird überantwortet werden, daß er gekreuziget werde.

3 **№ 3. Харал**

Сын Божы любы, чым ты правініўся,
За што суд жорсткі над табой чыніўся?
У чым віна? Ах, за якія дзеі -- цябе ў зладзеі?

Herzliebster Jesu, was hast du verbrochen,
Daß man ein solch scharf Urteil hat gesprochen?
Was ist die Schuld? In was für Missetaten bist du geraten?

4 **№ 4a**

ЕВАНГЕЛІСТ
Тады сабраліся першасьвятары і кніжнікі і старэйшыны народу ў двор да першасьвятара, якога звалі Каяфа, і яны дамаўляліся, як ім хітрасьцю ўзяць Ісуса і забіць яго.Але казалі яны:

EVANGELISTA
Da versammleten sich die Hohenpriester und Schriftgelehrten und die Ältesten im Volk in dem Palast des Hohenpriesters, der da hieß Kaiphas. Und hielten Rat, wie sie Jesum mit Listen griffen und töteten. Sie sprachen aber:

**№ 4b**

ХОР I і II
Толькі ня ў сьвята. каб ня сталася абурэньня ў народзе.

CHORUS I u. II
Ja nicht auf das Fest, auf daß nicht ein Aufruhr werde im Volk.

**№ 4c**

ЕВАНГЕЛІСТ
Калі Ісус быў у Віфаніі, у доме Сымона пракажонага, падышла да яго жанчына з алавастравай пасудзінай міра каштоўнага і ліла яму на галаву, калі Ён ляжаў за сталом. Убачыўшы, вучні Ягоныя абурыліся і казалі:

EVANGELISTA
Da nun Jesus war zu Bethanien, im Hause Simonis, des Aussätzigen, trat zu ihm ein Weib, die hatte ein Glas mit köstlichem Wasser, und goß es auf sein Haupt, da er zu Tische saß. Da das seine Jünger sahen, wurden sie unwillig und sprachen:

**№ 4d**

ХОР I
Навошта такое марнатраўства? Бо можна было б прадаць гэтае міра за вялікія грошы і даць убогім.

CHORUS I
Wozu dienet dieser Unrat? Dieses Wasser hätte mögen teuer verkauft und den Armen gegeben werden.

**№ 4e**

ЕВАНГЕЛІСТ
Але Ісус, пачуўшы гэта, сказаў ім:

EVANGELISTA
Da das Jesus merkte, sprach er zu ihnen:

ІСУС
Што бянтэжыце жанчыну? Яна добры ўчынак зрабіла дзеля Мяне; бо заўсёды ўбогіх вы маеце пры сабе, а Мяне не заўсёды маеце;бо выліўшы гэтае міра на Цела Маё. яна падрыхтавала Мяне да пахаваньня; праўду кажу вам: дзе ні будзе абвешчана Дабравесьце гэтае ў цэлым сьвеце, сказана будзе ў памяць яе і пра тое, што зрабіла яна.

JESUS
Was bekümmert ihr das Weib? Sie hat ein gut Werk an mir getan. Ihr habet allezeit Armen bei euch, mich aber habt ihr nicht allezeit. Daß sie dies Wasser auf meinen Leib gegossen, hat sie getan, daß man mich begraben wird. Wahrlich, ich sage euch: Wo dies Evangelium geprediget wird in der ganzen Welt, da wird man auch sagen zu ihrem Gedächtnis, was sie getan hat.

5 **№ 5. Recitativo**

| | |
|---|---|
| О добры Збаўца мой, | Du lieber Heiland du, |
| Калі мужам дурным няясна, | Wenn deine Jünger töricht streiten, |
| Чаму ёй час настаў | Daß dieses fromme Weib |
| Падрыхтоваць Хрыста | Mit Salben deinen Leib |
| Да савана заўчасна, | Zum Grabe will bereiten, |
| Дазволь і мне на супакой | So lasse mir inzwischen zu, |
| Патокам слёз, вачэй бальзамам | Von meiner Augen Tränenflüssen |
| Табе ўслужыцца гэтак сама. | Ein Wasser auf dein Haupt zu gießen. |

6 **№ 6. Арыя** (Альт)

| | |
|---|---|
| Каяньне | Buß und Reu |
| Рве пакутай сэрца мне; | Knirscht das Sündenherz entzwei, |
| А тваім збалелым ранам | Daß die Tropfen meiner Zähren |
| Пакаяньне ад мяне | Angenehme Spezerei, |
| Будзе, Езус, хай бальзамам. | Treuer Jesu. dir gebären. |
| Каяньне... | Buß und Reu... |

7 **№ 7**

ЕВАНГЕЛІСТ
Тады адзін з дванаццаці, якога звалі Юда Іскарыёт, пайшоў да сьвятароў і сказаў:

EVANGELISTA
Da ging hin der Zwölfen einer, mit Namen Judas Ischarioth, zu den Hohenpriestern und sprach:

ЮДА
Што вы дасьце мне, і я вам Яго выдам.

JUDAS
Was wollt ihr mir geben? Ich will ihn euch verraten?

ЕВАНГЕЛІСТ
Яны прапанавалі яму трыццаць срэбранікаў; і з таго часу ён шукаў нагоды выдаць Яго.

EVANGELISTA
Und sie boten ihm dreißig Silberlinge. Und von dem an suchte er Gelegenheit, daß er ihn verriete.

8 **№ 8. Арыя** (Сапрана)

| | |
|---|---|
| Сэрца о, крывёй сплывай! | Blute nur, du liebes Herz! |
| Ах! дзіця, што ты ўскарміла, | Ach, ein Kind, das du erzogen, |
| Да грудзей сваіх туліла, | Das an deiner Brust gesogen, |
| Сьмерць табе нясе з сабою, | Droht den Pfleger zu ermorden, |
| Бо яно ўзрасло зьмяёю. | Denn es ist zur Schlange worden. |
| Сэрца, о… | Blute nur... |

9 **№ 9a**

ЕВАНГЕЛІСТ
У першы ж дзень праснакоў падступіліся вучні да Ісуса і сказалі яму:

EVANGELISTA
Aber am ersten Tage der süßen Brot traten die Jünger zu Jesu und sprachen zu ihm:

**№ 9b. Хор I**

| | |
|---|---|
| Дзе ты хочаш, каб мы рыхтавалі | Wo willst du, daß wir dir bereiten, |
| табе есьці пасху? | das Osterlamm zu essen? |

**№ 9с**

ЕВАНГЕЛІСТ
Ён сказаў:

EVANGELISTA
Er sprach:

ІСУС
Ідзеце ў горад да такога а такога і скажэце яму: Настаўнік кажа: час Мой блізкі, у цябе ўчыню пасху з вучнямі Маімі.

JESUS
Gehet ihn in die Stadt zu einem, und sprecht zu ihm: Der Meister läßt dir sagen: Meine Zeit ist hier, ich will bei dir die Ostern halten mit meinen Jüngern.

ЕВАНГЕЛІСТ
І зрабілі вучні, як загадаў ім Ісус, і прыгатавалі на пасху ягня. І калі зьвечарэла, Ён узьлёг з дванаццацьцю вучнямі за сталом; і калі яны елі, сказаў:

EVANGELISTA
Und die Jünger täten, wie ihnen Jesus befohlen hatte, und bereiteten das Osterlamm. Und am Abend satzte er sich zu Tische mit den Zwölfen. Und da sie aßen, sprach er:

ІСУС
Праўду кажу я вам, што адзін з вас Мяне прадасьць.

JESUS
Wahrlich ich sage euch: Einer unter euch
wird mich verraten.

ЕВАНГЕЛІСТ
Яны вельмі засмуціліся і пачалі, кожны зь іх паасобку, казаць Яму:

EVANGELISTA
Und sie wurden sehr betrübt, und huben an, ein jeglicher unter ihnen, und sagten zu ihm:

**№ 9е. Хор I**

| | |
|---|---|
| Госпадзе, я? | Herr, bin ich's? |

10 **№ 10. Харал**

| | |
|---|---|
| Я той, чый грэх бязьмежны, | Ich bin's, ich sollte büßen, |
| Душой і целам грэшны | An Händen und an Füßen |
| Я -- пекла заслужыў! | Gebunden in der Höll'! |
| Няхай бы ўся навала | Die Geißelung, die Banden, |
| На долю мне прыпала -- | Und was du ausgestanden, |
| Маёй зьняможанай душы! | Das hat verdienet meine Seel'. |

ЕВАНГЕЛІСТ
А Ён сказаў у адказ:
EVANGELISTA
Er antwortete und sprach:

ІСУС
Хто апусьціў са Мною руку ў місу, той выдасьць Мяне; зрэшты, Сын Чалавечы ідзе, як напісана пра Яго; але гора таму чалавеку, якім Сын Чалавечы прадаецца: лепей было б чалавеку гэтаму ніколі не радзіцца на сьвет.
JESUS
Der mit der Hand mit mir in die Schüssel tauchet, der wird mich verraten. Des Menschen Sohn gehet zwar dahin, wie von ihm geschrieben stehet; doch wehe dem Menschen, durch welchen des Menschensohn verraten wird. Es wäre ihm besser, daß derselbige Mensch noch nie geboren wäre.

ЕВАНГЕЛІСТ
У адказ жа Юда, які выдаў Яго, сказаў:
EVANGELISTA
Da antwortete Judas, der ihn verriet, und sprach:

ЮДА
Ці ня я, Равьві?
JUDAS
Bin ich's, Rabbi?

ЕВАНГЕЛІСТ
Ісус кажа яму:
EVANGELISTA
Er sprach zu ihm:
ІСУС
Ты кажаш.
JESUS
Du sagest's.

ЕВАНГЕЛІСТ
А калі яны елі: Ісус, узяўшы хлеб і дабраславіўшы, разламаў і, падаючы вучням, сказаў:
EVANGELISTA
Da sie aber aßen, nahm Jesus das Brot, dankete und brach's, und gab's den Jüngern und sprach:

ІСУС
Прымеце, ежце, гэта Цела Маё.
JESUS
Nehmet, esset, das ist mein Leib.
ЕВАНГЕЛІСТ
І ўзяўшы чару, і падзякаваўшы, падаў ім і сказаў:
EVANGELISTA

Und er nahm den Kelch und dankete, gab ihnen den, und sprach:

ІСУС
Пеце зь яе ўсе; бо гэта Кроў Мая новага запавету, за многіх праліваная дзеля дараваньня грахоў. Кажу я вам, што ад сёньня ня буду піць ад плоду гэтага вінаграднага да таго дня, калі буду піць з вамі новае віно ў Царстве Айца Майго.

JESUS
Trinket alle daraus, das ist mein Blut des neuen Testaments, welches vergossen wird für Viele, zur Vergebung der Sünden. Ich sage euch: Ich werde von nun an nicht mehr von diesem Gewächs des Weinstocks trinken, bis an den Tag, da ich's neu trinken werde mit euch in meines Vaters Reich.

12 **№ 12. Recitativo**

| | |
|---|---|
| Хоць сэрца ўсё сплыло сьлязой, | Wiewohl mein Herz in Tränen schwimmt, |
| Бо разьвітаўся мой Ісус са мной, | Daß Jesus von mir Abschied nimmt, |
| Але праклаў нам сьлед у новы сьвет: | So macht mich doch sein Testament erfreut: |
| Даў плоць і кроў -- у запавет, | Sein Fleisch und Blut, o Kostbarkeit, |
| Даў мне у спадчыну, як сонца. | Vermacht er mir in meine Hände. |
| І хоць яго прадажны сьвет на мукі | Wie er es auch der Welt mit denen Seinen |
| Аддаў у злыя рукі, | Nicht böse können meinen, |
| Ён палюбіў людзей бясконца. | So liebt er sie bis an das Ende. |

13 **№ 13. Арыя** (Сапрана)

| | |
|---|---|
| Дар Табе мой -- сэрца, Спасе, | Ich will dir mein Herze schenken, |
| Я ўвайду ў яго душой, | Senke dich, mein Heil, hinein. |
| Каб сама з Табой зраслася,-- | Ich will mich in dir versenken, |
| Ды малы Табе сьвет мой -- | Ist dir gleich die Welt zu klein, |
| Будзь Ты мне, Гасподзь, зямлёй, | Ei, so sollst du mir allein |
| Сьветам будзь, Ісусе мой. | Mehr als Welt und Himmel sein. |
| | |
| Дар Табе мой... | Ich will dir ... |

14 **№ 14**

ЕВАНГЕЛІСТ
І заспяваўшы песьню пахвальную, яны пайшлі на гару Аліўную. Тады кажа ім Ісус:

EVANGELISTA
Und da sie den Lobgesang gesprochen hatten, gingen sie hinaus an den Ölberg. Da srach Jesus zu ihnen:

ІСУС
Усе вы запаняверыцеся ўва мне ў гэтую ноч, бо напісана: "паражу пастыра, і расьсеюцца авечкі статку". А пасьля ўваскрэсеньня Майго сустрэну вас у Галілеі.

JESUS

In dieser Nacht werdet ihr euch alle ärgern an mir, denn es stehet geschrieben: Ich werde den Hirten schlagen, und die Schafe der Herde werden sich zerstreuen. Wenn Ich aber auferstehe, will Ich vor euch hingehen in Galiläam.

15 **№ 15. Харал**

| | |
|---|---|
| Пазнай мяне, мой пастыр, | Erkenne mich, mein Hüter, |
| Пара к табе, пара! | Mein Hirte, nimm mich an! |
| Крыніца шчодрай ласкі, | Von dir, Quell aller Güter, |
| Ты столькі даў дабра. | Ist mir viel Gut's getan. |
| Карміў, паіў і собіў | Dein Mund hat mich gelabet |
| Салодкай пестай ты, | Mit Milch und süßer Kost, |
| Твой дух мяне спадобіў | Dein Geist hat mich begabet |
| Нябеснай мілаты. | Mit mancher Himmelslust. |

16 **№ 16**

ЕВАНГЕЛІСТ
У адказ жа Пётр сказаў Яму:
EVANGELISTA
Petrus aber antwortete und sprach zu ihm:

ПЁТР
Калі і ўсе запаняверацца ў Табе, я не запаняверуся ніколі і нізавошта.
PETRUS
Wenn sie auch alle sich an dir ärgerten, so will ich doch mich nimmermehr ärgern.

ЕВАНГЕЛІСТ
Сказаў яму Ісус:
EVANGELISTA
Jesus sprach zu ihm:

ІСУС
Праўду кажу табе, што гэтае ночы, перш чым певень засьпявае, тройчы адрачэшся ад Мяне.
JESUS
Wahrlich, ich sage dir: in dieser Nacht, ehe der Hahn krähet, wirst du mich dreimal verleugnen.

ЕВАНГЕЛІСТ
Кажа Яму Пётр:
EVANGELISTA
Petrus sprach zu ihm:
ПЁТР
Хоць бы прыпала мне і памерці з Табою, не адракуся ад Цябе.
PETRUS
Und wenn ich mit dir sterben müßte, so will ich dich nicht verleugnen.

ЕВАНГЕЛІСТ
Падобнае і ўсе вучні казалі.

EVANGELISTA
Desgleichen sagten auch alle Jünger.

17 **№ 17. Харал**

| | |
|---|---|
| Хачу стаяць з табою, | Ich will hier bei dir stehen, |
| Мне ты -- нябесны дар! | Verachte mich doch nicht! |
| Хачу прыняць душою | Von dir will ich nicht gehen, |
| Апошні сэрца ўдар. | Wenn dir dein Herze bricht. |
| Як толькі разарвецца | Wenn dein Herz wird erblassen |
| Яно ў тваіх грудзях, | Im letzten Todesstoß, |
| Сабе яго у сэрца | Alsdenn will ich dich fassen |
| Прыму як твой працяг. | In meinen Arm und Schoß. |

18 **№ 18**

ЕВАНГЕЛІСТ
Потым прыходзіць з імі Ісус у мясьціну, званую Гефсіманія, і кажа вучням Сваім:

EVANGELISTA
Da kam Jesus mit ihnen zu einem Hofe, der hieß Gethsemane, und sprach zu seinen Jüngern:

ІСУС
Пасядзеце тут, пакуль Я пайду, памалюся там.

JESUS
Setzet euch hie, bis daß ich dorthin gehe und bete.

ЕВАНГЕЛІСТ
І ўзяўшы Пятра і абодвух сыноў Зэвядзеевых. пачаў смуткаваць і журыцца. Тады кажа ім Ісус:

EVANGELISTA
Und nahm zu sich Petrum und die zween Söhne Zebedäi, und fing an zu trauern und zu zagen. Da sprach Jesus zu ihnen:

ІСУС
Душа Мая смуткуе да сьмерці; пабудзьце тут і чувайце са Мною.

JESUS
Meine Seele ist betrübt bis an den Tod, bleibet hie, und wacht mit mir.

19 **№ 19 Recitativo [*з Харалам*]**

| | |
|---|---|
| О боль! Аж сэрца з роспачы дрыжыць! | O Schmerz! Hier zittert das gequälte Herz! |
| Аж грудзі рве! На твары цень пакут! | Wie sinkt es hin, wie bleicht sein Angesaicht! |
| *За што пакуты гэтыя прыпалі?* | *Was ist die Ursach' aller solcher Plagen?* |
| Судзьдзя вядзе яго на суд, -- | Der Richter führt ihn vor Gericht, |

KUNIKAT.org

| | |
|---|---|
| А праўды ані там, ні тут! | Da ist kein Trost, kein Helfer nicht. |
| *Ах, то ж мае грахі прычынай сталі!* | *Ach, meine Sünden haben dich geschlagen!* |
| За грэх чужы нясе цярніну | Er leidet alle Höllenqualen. |
| І нашу сплачвае даніну. | Er soll vor fremden Raub bezahlen. |
| *Ах, Божа Хрысце, я пакут, прычына* | *Ich, ach Herr Jesu, habe dies verschuldet,* |
| *Мая правіна!* | *Was du erduldet!* |
| Ах, каб любоў к табе мая | Ach! könnte meine Liebe dir, |
| Спыніць магла альбо пасобіць несьці | Mein Heil, dein Zittern und dein Zagen |
| Твае цярпеньні і балесьці, -- | Vermindern oder helfen tragen, |
| Прыняў бы кару я! | Wie gerne blieb' ich hier! |

20 **№ 20. Арыя** (Тэнар) **a doi Cori**

| | |
|---|---|
| *Solo:* | *Solo:* |
| Чуваць хачу з маім Ісусам. | Ich will bei meinem Jesu wachen. |
| *Chor:* | *Chor:* |
| *Так лягчэй заснуць грахам* | *So schlafen unsre Sünden ein.* |
| *Solo:* | *Solo:* |
| Так мой скон апраўдае скрухай ён, | Meinen Tod büßet seiner Seelen Not. |
| Яго журба мне грэе сэрца. | Sein Trauren machet mich voll Freuden. |
| *Chor:* | *Chor:* |
| *З пакут яго няхай пральецца* | *Drum muß uns sein verdienstlich Leiden* |
| *І слодыч і гаркота нам.* | *Recht bitter und doch süße sein.* |
| *Solo:* | *Solo:* |
| Чуваць хачу з маім Ісусам... | Ich will bei meinem Jesu wachen... |

21 **№ 21**

ЕВАНГЕЛІСТ
І адышоўшы крыху, упаў на аблічча Сваё, маліўся і казаў:

EVANGELISTA
Und ging hin ein wenig, fiel nieder auf sein Angesicht, und betete und sprach:

ІСУС
Войча Мой! Калі магчыма, хай абміне Мяне чара гэтая: але не як Я хачу, а як Ты хочаш.

JESUS
Mein Vater, ist's möglich; so gehe dieser Kelch von mir; doch nicht wie ich will, sondern wie du willst.

22 **№ 22 Recitativo**

| | |
|---|---|
| Упаў у ногі Госпаду мой Збаўца, | Der Heiland fällt vor seinem Vater nieder, |
| Каб так узвысіць нас да Бога | Dadurch erhebt er mich und alle |

| | |
|---|---|
| З граху ліхога | Von unserm Falle |
| Туды, увысь, у ласку дацца. | Hinauf zu Gottes Gnade wieder. |
| Гатовы ён, | Er ist bereit, |
| Піць горыч сьмерці з поўнай чары, | Den Kelch, des Todes Bitterkeit zu trinken, |
| Людскіх грахоў смярдзючы гной, | In welchen Sünden dieser Welt |
| Каб так ад нас адвесьці ўдары, | Gegossen sind und häßlich stinken, |
| Бо так Гасподзь управіў мой! | Weil es dem lieben Gott gefällt. |

23 **№ 23. Арыя** (Бас)

| | |
|---|---|
| Я хачу душой скарыцца, | Gerne will ich mich bequemen |
| Выпіць чару, з крыжам зьліцца, | Kreuz und Becher anzunehmen, |
| З чары Збаўцы прагну піць. | Trink ich doch dem Heiland nach. |
| Рот Яго | Denn sein Mund, |
| Малаком крынічыць, мёдам | Der mit Milch und Honig fließet, |
| Зь берагоў -- | Hat den Grund |
| Дапаможа пражыць | Und des Leidens herbe Schmach |
| Сорам, крыўду -- з асалодай. | Durch den ersten Trunk versüßet. |
| | |
| Я хачу душой… | Gerne will ich... |

24 **№ 24**

ЕВАНГЕЛІСТ
І прыходзіць да вучняў і застае, што яны сьпяць, і кажа ім:

EVANGELISTA
Und er kam zu seinen Jüngern, und fand sie schlafend, und sprach zu ihnen:

ІСУС
Ці так не змаглі вы адну гадзіну чуваць са Мною? Чувайце і малецеся, каб не паддацца спакусе: дух бадзёры, а плоць нядужая.

JESUS
Könnet ihr denn nicht eine Stunde mit mir wachen? Wachet und betet, daß ihr nicht in Anfechtung fallet. Der Geist ist willig, aber das Fleisch ist schwach.

ЕВАНГЕЛІСТ
Яшчэ, адышоўшы другі раз, маліўся, кажучы:

EVANGELISTA
Zum andern Mal ging er hin, betete und sprach:

ІСУС
Войча Мой!калі ня можа чара гэтая абмінуць Мяне, каб Мне ня піць яе, хай будзе воля Твая.

JESUS
Mein Vater, ist’s nicht möglich, daß dieser Kelch von mir gehe, ich trinke ihn denn; so geschehe dein Wille.

25 **№ 25. Харал**

| | |
|---|---|
| Што хоча Бог, таму і быць, | Was mein Gott will, das g'scheh' allzeit, |
| Ягонай волі згодна, | Sein Will', der ist der beste, |
| Таму паможа ў ласцы жыць, | Zu helfen den'n er ist bereit, |
| Хто верыць богаўгодна, | Die an ihn glauben feste, |
| Не прападзе | Er hilft aus Not, |
| І ўцьвердзіў Бог, | Der fromme Gott, |
| Ў ліхой бядзе,-- | Und züchtiget mit Maßen. |
| Хто Бога ў сэрцы мае. | Wer Gott vertraut, |
| Таго збярог | Fest auf ihn baut, |
| Таго не пакідае. | Den will er nicht verlassen. |

26 **№ 26**

ЕВАНГЕЛІСТ

І прыйшоўшы, застаў, што яны зноў сьпяць, бо ў іх вочы ацяжэлі. І пакінуўшы іх, адышоў зноў і памаліўся трэці раз, тое самае слова сказаўшы. Тады прыходзіць да вучняў Сваіх і кажа ім:

EVANGELISTA

Und er kam und fand sie aber schlafend, und ihre Augen waren voll Schlaf's. Und er ließ sie, und ging abermals hin und betete zum drittenmal, und redete dieselbigen Worte. Da kam er zu seinen Jüngern und sprach zu ihnen:

ІСУС

Ах! вы ўсё яшчэ сьпіце і спачываеце; вось наблізілася гадзіна, і Сын Чалавечы аддаецца ў рукі грэшнікаў; устаньце, хадземце: вось наблізіўся той, хто выдае Мяне.

JESUS

Ach! Wollt ihr nun schlafen und ruhen? Sieh, die Stunde ist hie, daß des Menschen Sohn in der Sünder Hände überantwortet wird.Stehet auf, lasset uns gehen; sieh, er ist da, der mich verrät.

ЕВАНГЕЛІСТ

І калі яшчэ гаварыў Ён, вось, Юда, адзін з дванаццаці, прыйшоў, і зь ім мноства людзей зь мечамі і каламі, ад першасьвятароў і старэйшынаў народных.А хто выдаваў Яго, даў знак, кажучы: каго я пацалую, Той і ёсьць, вазьмеце Яго. І адразу, падышоўшы да Ісуса, сказаў:

EVANGELISTA

Und als er noch redete, siehe, da kam Judas, der Zwölfen Einer, und mit ihm eine große Schar, mit Schwerten und mit Stangen, von den Hohenpriestern und Ältesten des Volks; und der Verräter hatte ihnen ein Zeichen gegeben und gesagt:

ЮДА

Радуйся, Равьві!

JUDAS

Gegrüßet sei'st du, Rabbi!

ЕВАНГЕЛІСТ
І пацалаваў Яго. А Ісус сказаў яму:

EVANGELISTA
Und küssete ihn. Jesus aber sprach zu ihm:

ІСУС
Дружа, чаго ты прыйшоў?

JESUS
Mein Freund, warum bist du kommen?

ЕВАНГЕЛІСТ
Тады падышлі, і паклалі рукі на Ісуса, і ўзялі Яго

EVANGELISTA
Da traten sie hinzu, und legten die Hände an Jesum, und griffen ihn.

27 **№ 27a. Арыя [дуэт з *Хорам II*]**

| | |
|---|---|
| Вось майго Хрыста схапілі. | So ist mein Jesus nun gefangen. |
| *Стойце! каты! гэта зло!* | *Laßt ihn! haltet! bindet nicht!* |
| | |
| Ноч, сьвятло | Mond und Licht |
| У нямой жудзе застылі. | Ist vor Schmerzen untergangen. |
| Бо майго Хрыста схапілі. | Weil mein Jesus ist gefangen. |
| *Стойце! каты! гэта зло!* | *Laßt ihn! haltet! bindet nicht!* |
| | |
| Вядуць яго, яго схапілі. | Sie führen ihn, er ist gebunden. |

**№ 27b. Хор I і II**

| | |
|---|---|
| Ці зьніклі грамы і маланкі у хмарах? | Sind Blitze, sind Donner in Wolken verschwunden? |
| Геена, -- разьзеўры агністую пашчу; | Eröffne den feurigen Abgrund, o Hölle; |
| Разбуры, патрушчы, панішчы лядашча | Zertrümmre, verderbe, verschlinge, zerschelle |
| Як выбухам іх -- | Mit plötzlicher Wut |
| Прадажніка злога, забойцаў ліхіх! | Den falschen Verräter, das mördische Blut! |

28 **№ 28**

ЕВАНГЕЛІСТ
І вось, адзін з тых, што былі зь Ісусам, працягнуўшы руку, дастаў меч свой і, ударыўшы раба першасьвятаровага, адсек яму вуха. Тады кажа яму Ісус:

EVANGELISTA
Und siehe, einer aus denen, die mit Jesu waren, reckete die Hand aus und schlug des Hohenpriesters Knecht und hieb ihm ein Ohr ab. Da sprach Jesus zu ihm:

ІСУС

Вярні меч твой у месца ягонае, бо ўсе, што возьмуць меч, ад мяча і загінуць;. альбо думаеш, што Я не магу цяпер упрасіць Айца Майго, і Ён дасьць Мне больш за дванаццаць легіёнаў анёлаў?. Як жа збудуцца Пісаньні, што так павінна быць?

JESUS

Stecke dein Schwert an seinen Ort; denn wer das Schwert nimmt, der soll durchs Schwert umkommen. Oder meinst du, daß ich nicht könnte meinen Vater bitten, daß er mir zuschickte mehr denn zwölf Legion Engel? Wie würde aber die Schrift erfüllet? Es muß also gehen.

ЕВАНГЕЛІСТ

У тую гадзіну сказаў Ісус народу:

EVANGELISTA

Zu der Stund' sprach Jesus zu den Scharen:

ІСУС

Быццам на разбойніка выйшлі вы зь мечамі і каламі ўзяць Мяне; кожны дзень з вамі сядзеў Я, вучачы ў храме, і вы ня бралі Мяне. А ўсё гэта было, каб збыліся Пісаньні прарокаў.

JESUS

Ihr seid ausgegangen als zu einem Mörder, mit Schwerten und mit Stangen, mich zu fahren; bin ich doch täglich bei euch gesessen und habe gelehret im Tempel, und ihr habt mich nicht gegriffen. Aber das ist alles geschehen, daß erfüllet würden die Schriften der Propheten.

ЕВАНГЕЛІСТ

Тады ўсе вучні, пакінуўшы Яго, паўцякалі.

EVANGELISTA

Da verließen ihn alle Jünger, und flohen.

29 **№ 29. Харал**

Твой грэх аплакаць час настаў,
О люд! Нам Бог прыслаў Хрыста,
Сына, да нас з вышыняў;
З улоньня дзевы ў сьветлы час
Прыйшоў з ратункам Ён да нас,
Прыйшоў Ён Божым Сынам.
Памерлым Ён жыцьцё прынёс,
І хворых ацаліў Хрыстос,
Пакуль прыйшла часіна
За нас, за нашыя грахі
Прыняць пакутны скон ліхі --
Зноў стацца Божым Сынам.

O Mensch, bewein' dein Sünde groß;
Darum Christus sein's Vaters Schoß
Äußert und kam auf Erden;
Von einer Jungfrau rein und zart
Für uns er hie geboren ward,
Er woll't der Mittler werden.
Den'n Toten er das Leben gab,
Und legt' dabei all' Krankheit ab,
Bis sich die Zeit herdrange,
Daß er für uns geopfert würd',
Trüg' unser Sünden schwere Bürd'
Wohl an dem Kreuze lange.

## 2 ЧАСТКА

### 1 № 30. Арыя [з *Хорам II*]

Ах! дзе ж мой Ісус цяпер!
*Куды ж ён пайшоў, твой каханы,*
*О красуня-жанчына?*

Бо ягня, магчыма, знікла?
*Куды твой каханы пайшоў?*

Ах! ягня у тыгра ў іклах!
Ах! куды ж Ісус пайшоў?
*Пашукаем яго з табою.*

Ах! што я скажу ў сваім сэрцы,
Калі са страхам яна папытае?
Ах! куды ж пайшоў Ісус?

Ach! Nun ist mein Jesus hin!
*Wo ist denn dein Freund hingegangen,*
*o du Schönste der Weibern?*

Ist es möglich, kann ich schauen?
*Wo hat sich dein Freund hingewandt?*

Ach! mein Lamm in Tigerklauen!
Ach! wo ist mein Jesus hin?
*So wollen wir mit dir ihn suchen.*

Ach! was soll ich der Seele sagen,
Wenn sie mich wird ängstlich fragen?
Ach! wo ist mein Jesus hin?

### 2 № 31

ЕВАНГЕЛІСТ

А тыя, што ўзялі Ісуса, завялі яго да Каяфы першасьвятара, куды сабраліся кніжнікі і старэйшыны. А Пётр ішоў сьледам за ім зводдаль, да двара першасьвятаровага і ўвайшоўшы ўсярэдзіну, сеў са слугамі, каб бачыць канец.. Першасьвятары і старэйшыны і ўвесь сынедрыён шукалі ілжывага сьведчаньня супроць Ісуса, каб аддаць Яго на сьмерць; і не знаходзілі.

EVANGELISTA

Die aber Jesum gegriffen hatten, führeten ihn zu dem Hohenpriester Kaiphas, dahin die Schriftgelehrten und Ältesten sich versammelt hatten. Petrus aber folgte ihm nach von ferne, bis in den Palast des Hohenpriesters; und ging hinein und satzte sich bei die Knechte, auf daß er sähe, wo es hinaus wollte. Die Hohenpriester aber und Ältesten, und der ganze Rat, suchten falsches Zeugnis wider Jesum, auf daß sie ihn töteten; und funden keines.

### 3 № 32. Харал

Фальшывы суд зьвёў запавет
Маной на глум, ілжывы сьвет
Злавіць у сеткі хоча.
Мой Бог вядзе
мяне ў бядзе, --
Крый нас ад фальшу, Войча.

Mir hat die Welt trüglich gericht’t
Mit Lügen und mit falschem G’dicht,
Viel Netz und heimlich Stricken.
Herr, nimm mein wahr
in dieser G’fahr,
B’hüt mich vor falschen Tücken.

4 **№ 33**

ЕВАНГЕЛІСТ
І хоць шмат ілжывых сьведкаў прыходзіла, не знайшлі. Але нарэшце прыйшлі два лжывыя сьведкі і сказалі:

EVANGELISTA
Und wiewohl viel falsche Zeugen herzutraten, funden sie doch keins. Zuletzt traten zween falsche Zeugen, und sprachen:

СЬВЕДКІ I і II
Ён казаў: “Магу разбурыць храм Божы і за тры дні збудаваць яго”.

TESTIS I u. II
Er hat gesagt: Ich kann den Tempel Gottes abbrechen und in drei Tagen denselben bauen.

ЕВАНГЕЛІСТ
І ўстаўшы, першасьвятар сказаў яму:

EVANGELISTA
Und der Hohepriester stund auf und sprsch zu ihm:

ПЕРШАСЬВЯТАР
Чаму нічога не адказваеш, што яны супроць цябе сьведчаць?

PONTIFEX
Antwortest du nichts zu dem, was diese wider dich zeugen?

ЕВАНГЕЛІСТ
А Ісус маўчаў.

EVANGELISTA
Aber Jesus schwieg stille.

5 **№ 34. Recitativo**

| | |
|---|---|
| Маўчыць Ісус на злыя нагаворы, | Mein Jesus schweigt zu falschen Lügen stille, |
| Каб тым адкрыць нам вочы, | Um uns damit zu zeigen, |
| Што воляю сваёй суд скоры | Daß sein erbarmensvoller Wille |
| За нас гатовы ён прыняць, | Vor uns zum Leiden sei geneigt, |
| Што мы ў часы ліхіх нягод | Und daß wir in der gleichen Pein |
| За прыклад браць яго | Ihm sollen ähnlich sein, |
| Павінны і цярпець у моўчы. | Und in Verfolgung stille schweigen. |

**№ 35. Арыя** (Тэнар)

| | |
|---|---|
| Цярпі! Цярпі! | Geduld! Geduld! |
| Языкоў ліхія жарты | Wenn mich falsche Zungen stechen. |
| Бязь віны сваёй цярпі -- | Leid’ ich wider meiner Schuld |
| Кпіны, зьдзек. | Schimpf und Spott, |
| Ах, мой Божа, чалавек | Ei! so mag der liebe Gott |
| За абразы помсты варты. | Meines Herzens Unschuld rächen. |
| | |
| Цярпі! Цярпі!.. | Geduld, Geduld... |

**№ 36a**

ЕВАНГЕЛІСТ
І першасьвятар сказаў яму:

EVANGELISTA
Und der Hohepriester antwortete, und sprach zu ihm:

ПЕРШАСЬВЯТАР
Заклінаю цябе Богам жывым, скажы нам, ці ты Хрыстос, Сын Божы?

PONTIFEX
Ich beschwöre dich bei dem lebendigen Gott, daß du uns sagest, ob du seiest Christus, der Sohn Gottes:

ЕВАНГЕЛІСТ
Кажа яму Ісус:

EVANGELISTA
Jesus sprach zu ihm:

ІСУС
Ты сказаў; нават маўляю вам: ад сёньня ўгледзіце Сына Чалавечага, што сядзіць праваруч сілы і ідзе на аблоках нябесных.

JESUS
Du sagest's. Doch sage ich euch: Von nun an wird's geschehen, daß ihr sehen werdet des Menschen Sohn sitzen zur Rechten der Kraft, und kommen in den Wolken des Himmels.

ЕВАНГЕЛІСТ
Тады першасьвятар разадраў адзеньне сваё і сказаў:

EVANGELISTA
Da zerriß der Hohepriester seine Kleider, und sprach:

ПЕРШАСЬВЯТАР
Ён блюзьнерыць. Навошта яшчэ нам сьведкі? Вось, вы чулі блюзьнерства ягонае!Як вам здаецца?

PONTIFEX
Er hat Gott gelästert. Was dürfen wir weiter Zeugnis? Siehe, jetzt habt ihr seine Gotteslästerung gehöret. Was dünket euch?

ЕВАНГЕЛІСТ
А яны сказалі ў адказ:

EVANGELISTA
Sie antworteten und sprachen:

**№ 36b. Хор I і II**

Ён варты сьмерці! Er ist des Todes schuldig!

**№ 36c**

ЕВАНГЕЛІСТ
Тады плявалі яму ў твар і тузалі яго; а іншыя білі па шчоках, і казалі:

EVANGELISTA
Da speieten sie aus in sein Angesicht, und schlugen ihn mit Fäusten. Etliche aber schlugen ihn ins Angesicht, und sprachen:

**№ 36d. Хор I і II**

| | |
|---|---|
| Скажы нам, Хрысьце, хто ўдарыў цябе? | Weissage uns, Christe, wer ist's, der dich schlug? |

8 **№ 37. Харал**

| | |
|---|---|
| Хто так цябе зьнявечыў. | Wer hat dich so geschlagen, |
| О Сыне Чалавечы, | Mein Heil, und dich mit Plagen |
| Хто так цябе зглуміў? | So übel zugericht. |
| Ня грэшнік ты на сьвеце, | Du bist ja nicht ein Sünder, |
| Як мы і нашы дзеці, | Wie wir und unsre Kinder; |
| Злачынства ня ўчыніў. | Von Missetaten weißt du nicht. |

9 **№ 38a**

ЕВАНГЕЛІСТ
А Пётр сядзеў звонку на дварэ. І падышла да яго адна служанка і сказала:
EVAнNGELISTA
Petrus aber saß draußen im Palast; und es trat zu ihm eine Magd, und sprach:

СЛУЖАНКА I
І ты быў зь Ісусам Галілеянінам.
ANCILLA I
Und du warest auch mit dem Jesu aus Galiläa.

ЕВАНГЕЛІСТ
Але ён адрокся перад усімі, сказаўшы:
EVANGELISTA
Er leugnete aber vor ihnen allen, und sprach:

ПЁТР
Ня ведаю, што ты кажаш.
PETRUS
Ich weiß nicht, was du sagest.

ЕВАНГЕЛІСТ
А калі ён выходзіў за браму, убачыла яго другая, і кажа тым, што былі там:
EVANGELISTA
Als er aber zur Tür hinausging, sahe ihn eine andere, und sprach zu denen, die da waren:

СЛУЖАНКА II
І гэты быў зь Ісусам Назарэем.

ANCILLA II
Dieser war auch mit dem Jesu von Nazareth.

ЕВАНГЕЛІСТ
І зноў адрокся ён, прысягнуўшы:
EVANGELISTA
Und er leugnete abermal und schwur dazu:

ПЁТР
Я ня ведаю гэтага чалавека.
PETRUS
Ich kenne des Menschen nicht.

ЕВАНГЕЛІСТ
Крыху пазьней падышлі тыя, што стаялі, і сказалі Пятру:
EVANGELISTA
Und über eine kleine Weile traten hinzu, die da stunden, und sprachen zu Petrus:

**№ 38b**

ХОР II
Сапраўды і ты зь іх, бо і гаворка твая выдае цябе.
CHORUS II
Wahrlich, du bist auch einer von denen, denn deine Sprache verrät dich.
ЕВАНГЕЛІСТ
Тады ён пачаў прысягаць і бажыцца:
EVANGELISTA
Da hub er an sich zu verfluchen:
ПЁТР
Я ня ведаю гэтага чалавека.
PETRUS
Ich kenne des Menschen nicht.

ЕВАНГЕЛІСТ
І тут жа засьпяваў певень. І згадаў Пётр словы, сказаныя яму Ісусам: перш чым засьпявае певень, тройчы адрачэшся ад мяне. І выйшаўшы вонкі, плакаў горка.
EVANGELISTA
Und alsbald krähete der Hahn. Da dachte Petrus an die Worte Jesu, da er zu ihm sagte: ehe der Hahn krähen wird, wirst du mich dreimal verleugnen. Und ging heraus, und weinete bitterlich.

10 **№39. Арыя** (Альт)

| | |
|---|---|
| О, жалю дай, | Erbarme dich, |
| Мой Бог, за слёзы ўмілажалься! | Mein Gott, um meiner Zähren willen; |
| Глянь: душой, | Schaue hier, |
| Сэрцам плачу прад табой, | Herz und Auge weint von dir |
| Жалю дай, | Bitterlich. |
| О, жалю дай, | Erbarme dich, |

Мой Бог, за сьлёзы ўмілажалься! Mein Gott, um meiner Zähren willen.

11 **№ 40. Харал**

Ухіліўся ад цябе я
Да цябе вярнуўся зноў;
Толькі Сын твой так умее
Сьмерцю нас вяртаць, сыноў.
А на мне ляжыць віна,
Літасьцю тваёй яна
Зноў злагоджана і зьнята,
І ў душы маёй зноў сьвята.

Bin ich gleich von dir gewichen,
Stell' ich mich doch wieder ein;
Hat uns doch dein Sohn verglichen
Durch sein' Angst und Todespein.
Ich verleugne nicht die Schuld,
Aber deine Gnad' und Huld
Ist viel größer als die Sünde,
Die ich stets in mir befinde.

12 **№ 41a**

ЕВАНГЕЛІСТ
Калі ж настала раніца, зрабілі нараду ўсе першасьвятары і старэйшыны народу супраць Ісуса, каб аддаць яго на сьмерць: і зьвязаўшы яго, завялі і перадалі яго Понцію Пілату, намесьніку. Тады Юда, які выдаў яго, убачыўшы, што засудзілі яго, і раскаяўшыся, аддаў трыццаць срэбранікаў першасьвятарам і старэйшынам, кажучы:

EVANGELISTA
Des Morgens aber hielten alle Hohenpriester und die Ältesten des Volks einen Rat über Jesum, daß sie ihn töteten. Und bunden ihn, führeten ihn hin, und überantworteten ihn dem Landpfleger Pontio Pilato. Da das sahe Judas, der ihn verraten hatte, daß er verdammt war zum Tode, gereute es ihn, und brachte her wieder die dreißig Silberrlinge den Hohenpriester und Ältesten, und sprach:

ЮДА
Зграшыў я, прадаўшы кроў нявінную.

JUDAS
Ich habe übel getan, daß ich unschuldig Blut verraten habe.

ЕВАНГЕЛІСТ
Яны ж сказалі:

EVANGELISTA
Sie sprachen:

**№ 41b. Хор I і II**

Што нам да таго? глядзі сам. Was gehet uns das an? Da siehe du zu.

**№ 41c**

ЕВАНГЕЛІСТ
І кінуўшы срэбранікі ў храме, ён адышоў; і пайшоўшы, павесіўся. Першасьвятары, узяўшы срэбранікі, сказалі:

EVANGELISTA
Und er warf die Silberlinge in den Tempel, hub sich davon,

ging hin, und erhängete sich selbst. Aber die Hohenpriester nahmen die Silberlinge, und sprachen:

ПЕРШАСЬВЯТАРЫ I і II
Не дазваляецца класьці іх у храмавую скарбніцу, бо гэта цана крыві.

PONTIFEX I u. II
Es taugt nicht, daß wir sie in den Gotteskasten legen, denn es ist Blutgeld.

13 **№ 42. Арыя** (Бас)

Я іду к майму Ісусу!
Вось, -- грашмі забойцам ён
Плаціць іх ганебны плён,
Прахлую спакусу!

Я іду к майму Ісусу!..

Gebt mir meinen Jesum wieder!
Seht, das Geld, der Mörderlohn,
Wirft euch der verlorne Sohn
Zu den Füßen nieder.

Gebt mir meinen Jesum wieder!..

14 **№ 43**

ЕВАНГЕЛІСТ
І зрабіўшы нараду, купілі на іх поле ганчара для пахаваньня чужынцаў; таму і называецца поле тое “полем крыві” па сёньняшні дзень; тады збылося сказанае праз прарока Ерамію, які кажа: і ўзялі трыццаць срэбранікаў, цану Ацэненага, Якога ацанілі сыны Ізраілевыя, і далі іх за поле ганчара, як сказаў мне Гасподзь. Ісус жа стаў перад намесьнікам. І спытаўся ў яго намесьнік, кажучы:

EVANGELISTA
Sie hielten aber einen Rat, und kauften einen Töpfersacker darum, zum Begräbnis der Pilger. Daher ist derselbige Acker genennet der Blutacker, bis auf den heutigen Tag. Da ist erfüllet, das gesagt ist durch den Propheten Jeremias, da er spricht: Sie haben genommen dreißig Silberlinge, damit bezahlet ward der Verkaufte, welchen sie kauften von den Kindern Israel; und haben sie gegeben um einen Töpfersacker, als mir der Herr befohlen hat. Jesus aber stand vor dem Landpfleger, und der Landpfleger fragte ihn, und sprach:

ПІЛАТ
Ты Цар Юдэйскі?

PILATUS
Bist du der Judenkönig?

ЕВАНГЕЛІСТ
А Ісус сказаў яму:

EVANGELISTA
Jesus aber sprach zu ihm:

ІСУС
Ты кажаш.

JESUS
Du sagest's.

ЕВАНГЕЛІСТ
І калі вінавацілі яго першасьвятары і старэйшыны, ён нічога не адказваў. Тады кажа яму Пілат:

EVANGELISTA
Und da er verklagt ward von den Hohenpriestern und Ältesten, antwortete er nichts. Da sprach Pilatus zu ihm:

ПІЛАТ
Ці ня чуеш, колькі сьведчаць супроць цябе?

PILATUS
Hörest du nicht, wie hart sie dich verklagen?

ЕВАНГЕЛІСТ
І не адказваў яму на ніводнае слова, так што намесьнік вельмі зьдзіўляўся.

EVANGELISTA
Und er antwortete ihm nicht auf ein Wort, also, daß sich auch der Landpfleger sehr verwunderte.

15 **№ 44. Харал**

| | |
|---|---|
| Давер свае дарогі | Befiehl du deine Wege |
| І ў сэрцы скрухі ўсе | Und was dein Herze kränkt |
| Таму, хто ўсе трывогі | Der allertreusten Pflege |
| І болесьці нясе, | Des, der den Himmel lenkt, |
| Хто хмарам, ветру ў небе | Der Wolken, Luft und Winden |
| Указвае шляхі, | Gibt Wege, Lauf und Bahn, |
| Ён і ў тваёй патрэбе | Der wird auch Wege finden, |
| Апора для нагі. | Da dein Fuß gehen kann. |

16 **№ 45а**

ЕВАНГЕЛІСТ
А на сьвята намесьнік меў звычай выпускаць народу аднаго вязьня, якога б хацелі. Быў тады ў іх вядомы вязень, званы Варава. І вось, як сабраліся яны, сказаў ім Пілат:

EVANGELISTA
Auf das Fest aber hatte der Landpfleger Gewohnheit, dem Volk einen Gefangenen loszugeben, welchen sie wollten. Er hatte aber zu der Zeit einen Gefangenen, einen sonderlichen vor andern, der hieß Barrabas. Und da sie versammelt waren, sprach Pilatus zu ihnen:

ПІЛАТ
Каго хочаце, каб я выпусьціў вам: Вараву ці Ісуса, якога завуць Хрыстом?

PILATUS
Welchen wollet ihr, daß ich euch losgebe? Barrabam, oder Jesum, von dem gesagt wird, er sei Christus.

ЕВАНГЕЛІСТ
Бо ведаў, што з зайздрасьці выдалі яго. Тым часам, як сядзеў ён на судовым месцы, жонка ягоная паслала яму сказаць:

EVANGELISTA
Denn er wußte wohl, daß sie ihn aus Neid überantwortet hatten. Und da er auf dem Richtstuhl saß, schickete sein Weib zu ihm, und ließ ihm sagen:

ПІЛАТАВА ЖОНКА
Не рабі нічога праведніку таму, бо я сёньня ў сьне шмат адцярпела за яго.

UXOR PILATI
Habe du nichts zu schaffen mit diesen Gerechten, ich habe heute viel erlitten im Traum von seinetwegen.

ЕВАНГЕЛІСТ
Але першасьвятары і старэйшыны падбухторылі люд прасіць Вараву, а Ісуса загубіць.Тады намесьнік сказаў у адказ:

EVANGELISTA
Aber die Hohenpriester und die Ältesten überredeten das Volk, daß sie um Barrabam bitten sollten, und Jesum umbrächten. Da antwortete nun der Landpfleger, und sprach zu ihnen:

ПІЛАТ
Каго хочаце з двух, каб я выпусьціў вам?

PILATUS
Welchen wollt ihr unter diesen zweien, den ich euch soll losgeben?

ЕВАНГЕЛІСТ
Яны сказалі:

EVANGELISTA
Sie sprachen:

ХОР I і II
Вараву!

CHORUS I u. II
Barrabam!

ЕВАНГЕЛІСТ
Кажа ім Пілат:

EVANGELISTA
Pilatus sprach zu ihnen:

ПІЛАТ
Што ж мне зрабіць зь Ісусам, якога завуць Хрыстом?

PILATUS
Was soll ich denn machen mit Jesu, von dem gesagt wird, er sei Christus?

ЕВАНГЕЛІСТ
Кажуць яму ўсе:
EVANGELISTA
Sie sprachen alle:

**№ 45b. Хор I і II**

| | |
|---|---|
| Хай будзе ўкрыжаваны! | Laß ihn kreuzigen. |

17 **№ 46. Харал**

| | |
|---|---|
| Выдатны вынік кары чалавечай! | Wie wunderbarlich ist doch diese Strafe! |
| Пастух цудоўны гіне за авечак; | Der gute Hirte leidet für die Schafe; |
| Віну ўзяў на сябе ён, Справядлівы, | Die Schuld bezahlt der Herre, der Gerechte, |
| За слуг шкадлівых! | Für seine Knechte! |

18 **№ 47**

ЕВАНГЕЛІСТ
А намесьнік сказаў:
EVANGELISTA
Der Landpfleger sagte:

ПІЛАТ
Якое ж ліха ўчыніў ён?
PILATUS
Was hat er denn Übels getan?

19 **№ 48. Recitativo**

| | |
|---|---|
| Ён нам усім рабіў дабро. | Er hat uns allen wohlgetan. |
| Сьляпым вярнуў здаровы зрок | Den Blinden gab er das Gesicht, |
| Расслабленым даў ногі; | Die Lahmen macht er gehend; |
| Айца свайго нам слова даў, | Er sagt' uns seines Vaters Wort, |
| Нячысьцікаў прагнаў; | Er trieb die Teufel fort; |
| Засмучаным даў светлы ўрок; | Betrübte hat er aufgericht't; |
| Надзеяй грэшных прасьвятліў; | Er nahm die Sünder auf und an; |
| І больш нічога не зрабіў. | Sonst hat mein Jesus nichts getan. |

20 **№ 49. Арыя**

| | |
|---|---|
| Карае Збаўцу псота злая, | Aus Liebe will mein Heiland sterben, |
| Хоць сам ня ведае віны, | Von einer Sünde weiß er nichts, |
| Кара вечная людская, | Daß das ewige Verderben |
| І асуда злой маны | Und die Strafe des Gerichts |
| Мір душы не закранае. | Nicht auf meiner Seele bliebe. |
| | |
| Карае Збаўцу... | Aus Liebe... |

KAMUNIKAT.org

21 **№ 50a**

ЕВАНГЕЛІСТ
Але яны яшчэ мацней крычалі:
EVANGELISTA
Sie schrieen aber noch mehr, und sprachen:

**№ 50b. Хор I і II**

Хай будзе ўкрыжаваны!
Laß ihn kreuzigen.

**№ 50c**

ЕВАНГЕЛІСТ
Пілат, бачачы, што нічога не дапамагае, а неспакой расьце, узяў вады і ўмыў рукі перад людзьмі, кажучы:
EVANGELISTA
Da aber Pilatus sahe, daß er nichts schaffete, sondern daß ein viel größer Getümmel ward, nahm er Waasser, und wusch die Hände vor dem Volk, und spraach:

ПІЛАТ
Не вінаваты я ў крыві Праведніка Гэтага; глядзеце самі.
PILATUS
Ich bin unschuldig an dem Blut dieses Gerechten, sehet ihr zu.
ЕВАНГЕЛІСТ
І, адказваючы, увесь люд сказаў:
EVANGELISTA
Da antwortete das ganze Volk, und sprach:

**№ 50d. Хор I і II**

Кроў Ягоная на нас і на дзецях нашых.
Sein Blut komme über uns und unsre Kinder.

**№ 50e**

ЕВАНГЕЛІСТ
Тады выпусьціў ім Вараву, а Ісуса, біўшы, аддаў на крыжаваньне.
EVANGELISTA
Da gab er ihnen Barrabam los; aber Jesum ließ er geißeln, und überantwortete ihn, daß er gekreuziget würde.

22 **№ 51 Recitativo**

Даруй, Гасподзь!
Erbarm es Gott!
Стаіць тут Збаўца бічаваны.
Hier steht der Heiland angebunden.
О кроў Яго, о боль, о раны!
O Geißelung, o Schläg', o Wunden!
Спыніце, каты, зьдзек!
Ihr Henker, haltet ein!
Няўжо у вас душы няма --
Erweichet euch der Seelen Schmerz,
Глядзець на боль Яго душы?
Der Anblick solchen Jammers nicht?
Ах, так!? У вас яна
Ach ja, ihr habt ein Herz,

| | |
|---|---|
| Цьвярдзейшая, чым чалавек | Das muß der Martersäule gleich, |
| Расьпяты на крыжы. | Und noch viel härter sein. |
| Спыніце, каты, зьдзек! | Erbarmt euch, haltet ein! |

23 **№ 52. Арыя** (Альт)

| | |
|---|---|
| Як сьляза ня мецьме сілы, | Können Tränen meiner Wangen |
| Божа мілы, | Nichts erlangen, |
| Сэрца мне крынічыць хай, | Oh, so nehmt mein Herz hinein! |
| Каб абмыць вадой гаючай | Aber laßt es bei den Fluten, |
| Кроў цярпеньняў, ран балючых, | Wenn die Wunden milde bluten, |
| Як з ахвярнай шалі -- дай! | Auch die Opferschale sein! |

1 **№ 53a**

ЕВАНГЕЛІСТ
Тады воіны намесьнікавы, узяўшы Ісуса ў прэторыю, сабралі на яго цэлы полк, і разьдзеўшы яго, надзелі на яго пурпуру; і, сплёўшы вянок зь цёрну, усклалі на галаву яму і далі яму ў правую руку кій, і, укленчыўшы перад ім, кпілі зь яго, кажучы:

EVANGELISTA
Da nahmen die Kriegsknechte des Landpflegers Jesum zu sich in das Richthaus,und sammleten über ihn die ganze Schar; und zogen ihn aus, und legeten ihm eine Purpurmantel an; und flochten eine Dornenkrone, und satzten sie auf sein Haupt, und ein Rohr in seine rechte Hand, und beugeten die Knie vor ihm, und spotteten ihn, und sprachen:

**№ 53b. Хор I і II**

| | |
|---|---|
| Радуйся, Цар Юдэйскі! | Gegrüßet seist du, Judenkönig! |

**№ 53c**

ЕВАНГЕЛІСТ
І плявалі на яго і, узяўшы кій, білі па галаве яго.

EVANGELISTA
Und speieten ihn an, und nahmen das Rohr, und schlugen damit sein Haupt.

2 **№ 54. Харал**

| | |
|---|---|
| О голаў, што у ранах, | O Haupt voll Blut und Wunden, |
| Які твой злы вырок, | Voll Schmerz und voller Hohn! |
| О голаў, што прыбрана, | O Haupt zu Spott gebunden |
| У церневы вянок, | Mit einer Dornenkron’! |
| О голаў, як ты зьзяла | O Haupt, sonst schön gezieret |
| У годнасьці, ў красе, | Mit höchster Ehr’ und Zier, |
| Яна цяпер апала. | Jetzt aber hoch schimpfieret: |
| А мне мілей за ўсе. | Gegrüßet seist du mir! |
| О годнае аблічча, -- | Du edles Angesichte, |
| Высокі сьвецкі суд | Vor dem sonst schrickt und scheut |

| | |
|---|---|
| Баіцца, і скавыча, | Das große Weltgewichte, |
| І лье паскудны бруд. | Wie bist du so bespeit! |
| Ты бледны твар пад небам! | Wie bist du so erbleichet, |
| Хто ж бляск вачэй тваіх, | Wer hat dein Augenlicht, |
| Спаганіў так ганебна, | Dem sonst kein Licht nicht gleichet, |
| Прыцьміў злачынна іх? | So schändlich zugericht’t? |

3 **№ 55**

ЕВАНГЕЛІСТ

І калі назьдзекаваліся зь яго, зьнялі зь яго пурпуру і апранулі яго ў адзежу ягоную, і павялі яго на крыжаваньне. Выходзячы, спаткалі яны аднаго Кірынеяніна, імем Сымон: яго і прымусілі несьці крыж ягоны.

EVANGELISTA

Und da sie ihn verspottet hatten, zogen sie ihm den Mantel aus, und zogen ihm seine Kleider an, und führeten ihn her, daß sie ihn kreuzigten. Und indem sie hinausgingen, funden sie einen Menschen von Kyrene, mit Namen Simon; den zwungen sie, daß er ihm sein Kreuz trug.

4 **№ 56. Recitativo**

| | |
|---|---|
| Так! Прагне наша кроў і наша плоць | Ja! freilich will in uns das Fleisch und Blut |
| Быць змушанай на крыж; | Zum Kreuz gezwungen sein; |
| Чым саладзей душы даброць, | Je mehr es unsrer Seele gut, |
| І чым кісьлей стаіш. | Je herber geht es ein. |

5 **№ 57. Арыя**

| | |
|---|---|
| Ляж, добры крыж, ляж мне на плечы; | Komm, süßes Kreuz, so will ich sagen, |
| Ісусе, дай яго; калі ж | Mein Jesu, gib es immer her! |
| Ня ў змогу будзе мне твой крыж, | Wird mir mein Leiden einst zu schwer, |
| Тады цяжар яго палегчы. | So hilf du mir es selber tragen. |
| | |
| Ляж, добры крыж... | Komm, süßes Kreuz... |

6 **№ 58а**

ЕВАНГЕЛІСТ

І прыйшоўшы на месца, якое называецца Галгофа, што азначае “месца чарапоў”, далі яму піць воцату, зьмяшанага з жоўцю; і, пакаштаваўшы, не хацеў піць. Тыя, што ўкрыжавалі яго, дзялілі вопратку ягоную, кідаючы жэрабя; і, седзячы, вартавалі яго там; і зьмясьцілі над галавою ягонай надпіс зь віною яго: Гэты ёсьць Ісус, Цар Юдэйскі. Тады ўкрыжавалі зь ім двух разбойнікаў: аднаго па правы бок, а другога па левы. А тыя, што міма праходзілі, зьневажалі яго, ківаючы галовамі сваімі і кажучы:

EVANGELISTA

Und da sie an die Stätte kamen mit Namen Golgatha, das ist

verdeutschet, Schädelstätt', gaben sie ihm Essig zu trinken mit Gallen vermischet; und da er's schmeckete, wollte er's nicht trinken. Da sie ihn aber gekreuziget hatten, teilten sie seine Kleider, und wurfen das Los darum; auf daß erfüllet würde, das gesagt ist durch den Propheten: sie haben meine Kleider unter sich geteilet, und über mein Gewandt haben sie das Los geworfen. Und sie saßen allda, und hüteten sein. Und oben zu seinem Häupte helfeten sie die Ursach seines Todes beschrieben, nämlichö Dies ist Jesaus, der Jüden König. Und da wurden zween Mörder mit ihm gekreuziget, einer zur Rechten, und einer zur Linken. Die aber vorübergingen, lästerten ihn, und schüttelten ihre Köpfe, und sprachen:

**№ 58b. Хор I і II**

Ты, што разбураеш храм і за тры дні будуеш! ўратуй сябе самога. Калі ты Сын Божы, сыйдзі з крыжа.

Der du den Tempel Gottes zerbrichst, und bauest ihn in dreien Tagen, hilf dir selbst. Bist du Gottes Sohn, so steig herab vom Kreuz.

**№ 58c**

ЕВАНГЕЛІСТ
Падобна і першасьвятары з кніжнікамі і старэйшынамі і фарысэямі, насьміхаючыся, казалі:

EVANGELISTA
Desgleichen auch die Hohenpriester spotteten sein, samt den Schriftgelehrten und Ältesten, und sprachen:

**№ 58d. Хор I і II**

Іншых ратаваў, а самога сябе ня можа ўратаваць. Калі ён Цар Ізраілеў, хай цяпер сыйдзе з крыжа, і ўверуем у яго; спадзяваўся на Бога: хай цяпер выбавіць яго, калі ён угодны яму. Бо ён сказаў: Я Божы Сын.

Andern hat er geholfen, und kann sich selber nicht helfen. Ist er der König Israels, so steige er nun vom Kreuz, so wollen wir ihm glauben. Er hat Gott vertrauet, der erlöse ihn nun, lüstrt's ihn; denn er hat gesagt: Ich bin Gottes Sohn.

**№ 58e**

ЕВАНГЕЛІСТ
Таксама і разбойнікі, укрыжаваныя зь ім, зьневажалі яго.

EVANGELISTA
Desgleichen schmäheten ihn auch die Mörder, die mit ihm gekreuziger waren.

7 **№ 59. Recitativo**

Ах, Голалгафа, ах, злашчасная гара! Ach, Golgatha, unsel'ges Golgatha!

| | |
|---|---|
| Гасподзь красы тут мусіў смерць прыняць ганебна, | Der Herr der Herrlichkeit muß schimpflich hier verderben, |
| Яго, сьвятло і мір зямлі, | Der Segen und das Heil der Welt |
| На крыж з праклёнам паднялі. | Wird als ein Fluch ans Kreuz gestellt. |
| У творцы неба, водаў, нетраў | Der Schöpfer Himmels und der Erden |
| Забралі тут зямлю й паветра; | Soll Erd' und Luft entzogen werden; |
| Нявіннасьць тут за грэх памерла: | Die Unschuld muß hier schuldig sterben: |
| Разьбілі скарбніцу дабра -- | Das gehet meiner Seele nah; |
| Ах, Голгафа, злашчасная гара! | Ach Golgatha, unsel'ges Golgatha! |

8 **№ 60. Арыя [*з Хорам II*]**

| | |
|---|---|
| Гляньце: пад рукой Хрыста | Sehet Jesus hat die Hand, |
| Вас чакае мілата, -- | Uns zu fassen ausgespannt; |
| Час! | Kommt! |
| *Куды?* | *Wohin?* |
| Хрысту у рукі, | In Jesu Armen |
| Там ратунак ваш ад мукі, | Sucht Erlösung, nehmt Erbarmen, |
| Клічце! | Suchet! |
| *Што?* | *Wo?* |
| Хрыстовы рукі. | In Jesu Armen. |
| Пад яго сьвятой рукой | Lebet, sterbet, ruhet hier, |
| Сьмерць, жыцьцё і ваш спакой, | Ihr verlaßnen Küchlein ihr, |
| Майце! | Bleibet! |
| *Што?* | *Wo?* |
| Хрыстовы рукі. | In Jesu Armen. |

9 **№ 61а**

ЕВАНГЕЛІСТ
Ад шостай жа гадзіны цемра настала па ўсёй зямлі да гадзіны дзявятай. А каля дзявятай гадзіны ўскрыкнуў Ісус моцным голасам, кажучы:

EVANGELISTA
Und von der sechsten Stunde an ward eine Finsternis über das ganze Land, bis zu der neunten Stunde. Und um die neunte Stunde schriee Jesus laut, und sprach:

ІСУС
Ілі, Ілі! лама савахвані?

JESUS
Eli, Eli, lama sabachthani?

ЕВАНГЕЛІСТ
Што азначае: Божа Мой, Божа Мой! чаму Ты Мяне пакінуў? Некаторыя, што стаялі там, чуючы гэта, казалі:

EVANGELISTA
Das ist: Mein Gott, mein Gott, warum hast du mich verlassen? Etliche aber, die da stunden, da sie das höreten, sprachen sie:

**№ 61b. Хор I**

| | |
|---|---|
| Ільлю кліча Ён. | Der rufet dem Elias! |

**№ 61c**

ЕВАНГЕЛІСТ
І адразу пабег адзін зь іх, узяў губку, намачыў у воцат і, насадзіўшы на кій, даваў яму піць; а другія казалі:

EVANGELISTA
Und bald lief einer unter ihnen, nahm einen Schwamm, und füllete ihn mit Essig, und steckete ihn auf ein Rohr, und tränkete ihn. Die andern aber sprachen:

**№ 61d. Хор II**

| | |
|---|---|
| Пастой; пабачым, ці прыйдзе Ільля ўратаваць яго. | Halt, laß sehen, ob Elias komme und ihm helfe |

**№ 61e**

ЕВАНГЕЛІСТ
А Ісус, зноў ўскрыкнуўшы моцным голасам, выпусьціў дух.

EVANGELISTA
Aber Jesus schriee abermal laut, und verschied.

10 **№ 62. Харал**

| | |
|---|---|
| Як прыйдзе час расстацца, -- | Wenn ich einmal soll scheiden, |
| Не пакідай мяне, | So scheide nicht von mir! |
| Ці сьмерці ў рукі здацца, -- | Wenn ich den Tod soll leiden, |
| Не пакідай мяне! | So tritt du denn herfür! |
| Калі страх сьцісьне сэрца | Wenn mir am allerbängsten |
| Што стане сьвет нямілі, | Wird um das Herze sein, |
| Дык дай мне моцы стрэцца | So reiß mich aus den Ängsten |
| З пакутай, дай мне сіл! | Kraft deiner Angst und Pein! |

11 **№ 63a**

ЕВАНГЕЛІСТ
І вось, завеса храма разадралася напалам, зьверху данізу; і зямля здрыганулася: і каменьне раскалолася; і магілы расчыніліся; і многія целы памерлых паўсталі;
і выйшаўшы з магілаў пасьля ўваскрэсеньня ягонага, увайшлі ў сьвяты горад і явіліся многім. А сотнік і тыя, што зь ім вартавалі Ісуса, бачачы землятрус і ўсё, што адбылося, перапалохаліся вельмі і казалі:

EVANGELISTA
Und siehe da, der Vorhang im Tempel zerriß in zwei Sctücke, von oben an bis unten aus. Und die Erde erbebete, und die Felsen zerrissen, und die Gräber täten sich auf, und stunden auf viel Leiber der Heiligen, die da schliefen; und gingen aus den Gräbern nach seiner Aufstehung, und kamen in die heilige

Stadt, und erschienen vielen.
Aber der Hauptmann, und die bei ihm waren, und bewahreten Jesum, da sie sahen das Erdbeben und was da geschah,erschraken sie sehr und sprachen:

**№ 63b. Хор I і II**

| | |
|---|---|
| Сапраўды ён быў Сын Божы. | Wahrlich, dieser ist Gottes Sohn gewesen. |

**№ 63c**

ЕВАНГЕЛІСТ
Там былі таксама і глядзелі здалёк многія жанчыны, якія ішлі сьледам за Ісусам з Галілеі, служачы яму; сярод іх былі Марыя Магдаліна і Марыя, маці Якава і Ёсіі, і маці сыноў Зэвядзеевых. Калі ж зьвечарэла, прыйшоў багаты чалавек з Арыматэі, імем Язэп, які таксама вучыўся ў Ісуса; ён, прыйшоўшы да Пілата, прасіў цела Ісусавага. Тады Пілат загадаў аддаць цела.
Und es waren viel Weiber da, die von ferne zusahen, die da waren nachgefolget aus Galiläa, und hatten ihm gedienet; unter welchen war Maria Magdalen, und Maria, die Mutter Jacobi und Josaes, und die Mutter der Kinder Zebedäi.
Am Abend aber kam ein reicher Mann von Arimathia, der hieß Joseph, welcher auch ein Jünger Jesu war. Der ging zu Pilato, und bat ihn um den Leichnam Jesu.
Da befahl Pilatus, man sollte ihm ihn geben.

12 **№ 64. Recitativo**

| | |
|---|---|
| Халодным вечарам Адам | Am Abend da es kühle war, |
| Душу сваю на грэх аддаў. | Ward Adams Fallen offenbar. |
| І Бог караў увечары няверных. | Am Abend drücket ihn der Heiland nieder. |
| На вечар час прыпаў галубцы | Am Abend kam die Taube wieder, |
| З галінкаю вярнуцца ў дзюбцы. | Und trug ein Ölblatt in dem Munde. |
| О шчасны час! О час вячэрні! | O schöne Zeit! O Abendstunde! |
| І вось нам мір -- мір з Богам даў Хрыстос, | Der Friedensschluß ist nun mit Gott gemacht, |
| Бо сам свой крыж за нас панёс. | Denn Jesus hat sein Kreuz vollbracht. |
| Спакой Хрысту -- ў душу. | Sein Leichnam kömmt zur Ruh. |
| Ах! добрая душа, прашу: | Ach! liebe Seele, bitte du, |
| Вось, цела мёртвага вазьмі з сабою, | Geh, lasse dir den toten Jesum schenken, |
| О гойны дар, о памяць зь мілатою! | O heilsames, o köstlich's Angedenken! |

13 **№ 65. Арыя** (Бас)

| | |
|---|---|
| Сэрца, будзь у чысьціні,-- | Mache dich, mein Herze, rein, |
| Сам Хрыста я пахаваю. | Ich will Jesum selbst begraben. |
| Бо цяпер Ён ува мне, | Denn er soll nunmehr in mir |
| Ён ва мне | Für und für |
| Свой спакой салодкі мае, | Seine süße Ruhe haben. |

Сьвет, пусьці, Хрыста прымі! Welt, geh aus, laß Jesum ein!

Сэрца, будзь… Mache dich...

14 **№ 66a**

ЕВАНГЕЛІСТ
І ўзяўшы цела, Язэп абгарнуў яго чыстым палатном і паклаў яго ў новай сваёй магіле, якую высек у скале; і прываліўшы вялікі камень да дзьвярэй магілы, адышоў. Была ж там Марыя Магдаліна і другая Марыя, якія сядзелі насупраць магілы. На другі дзень, які ідзе за пятніцай, сабраліся першасьвятары і фарысэі да Пілата і казалі:

EVANGELISTA
Und Joseph nahn den Leib, und wickelte ihn in ein rein Leinwand. Und legte ihn in sein eigen neu Grab, welches er hatte lassen in einen Felese hauen; und wälzete einen großen Stein vor die Tür, und ging davon. Es war aber allda Maria Magdalena, und die andere Maria, sie satzten sich gegen das Grab.
Des andern Tages, der da folget nach dem Rüsttage, kamen die Hohenpriester und Pharisäer sämtlich zu Pilato, und sprachen:

**№ 66b.Хор I і II**

Спадару! мы ўспомнілі, што ашуканец той, яшчэ калі быў жывы, сказаў: “праз тры дні ўваскрэсну”; дык вось, загадай вартаваць магілу да трэйцяга дня, каб вучні ягоныя, прыйшоўшы ўначы, ня ўкралі яго і не сказалі народу: “уваскрэс зь мёртвых”, і будзе апошняе ашуканства горшае за першае.

Herr, wir haben gedacht, daß dieser Verführer sprach, da er noch lebete: Ich will nach dreien Tagen wieder auferstehen. Darum befiehl, daß man das Grab verwahre bis an den dritten Tag, auf daß nicht seine Jünger kommen, und stehlen ihn, und sagen zu dem Volk: Er ist auferstanden von den Toten; und werde der letzte Betrug ärger, denn der erste.

**№ 66c**

ЕВАНГЕЛІСТ
А Пілат сказаў ім:

EVANGELISTA
Pilatus sprach zu ihnen:

ПІЛАТ
Маеце варту; ідзеце, ахоўвайце, як ведаеце.

PILATUS
Da habt ihr die Hüter; gehet hin, und verwahret’s, wie ihr’s wisset.

ЕВАНГЕЛІСТ

Яны пайшлі і ахоўвалі магілу, прыклаўшы пячатку да каменя і паставіўшы варту.

EVANGELISTA

Sie ginguen hin, und verwahreten das Grab mit Hütern, und versiegelten den Stein.

15 **№ 67. Recitativo** (*Сапрана, Альт, Тэнар, Бас, Хор I і II*)

| | |
|---|---|
| Цяпер здабыў Гасподзь спакой. | Nun ist der Herr zur Ruh gebracht. |
| *Дабранач, Збаўца мой!* | *Mein Jesu, gute Nacht!* |
| Мінуўся час турбот ад грэшнасьці людской. | Die Müh' ist aus, die unsre Sünden ihm gemacht. |
| *Дабранач, Збаўца мой!* | *Mein Jesu, gute Nacht!* |
| О любасны Ісусе, | O selige Gebeine |
| Я каяньнем да ранаў узнясуся, | Seht, wie ich euch mit Buß und Reu beweine, |
| Сьлязьмі адмыю грэх душэўны свой. | Daß euch mein Fall in solche Not gebracht. |
| *Дабранач, Збаўца мой!* | *Mein Jesu, gute Nacht!* |
| І віну | Habt lebenslang |
| Пакутамі ты адхінуў, | Vor euer Leiden tausend Dank, |
| За нас ахвяраю душы сваёй. | Daß ihr mein Seelenheil so wert geacht't. |
| *Дабранач, Збаўца мой!* | *Mein Jesu, gute Nacht!* |

16 **№ 68. Хор I і II**

| | |
|---|---|
| Душа твая ў спакой зьляцела. | Wir setzen uns mit Tränen nieder |
| Мы кленчым, клічам са сьлязьмі: | Und rufen dir im Grabe zu: |
| Сьпі у міры, зь мірам сьпі! | Ruhe sanfte, sanfte ruh'! |
| Сьпі, зьнясіленае цела! | Ruht, ihr ausgesognen Glieder! |
| *Сьпі у міры, зь мірам сьпі!* | *Ruhe sanfte, sanfte ruh'!* |
| Гэты дол і камень твой | Euer Grab und Leichenstein |
| Служаць добраму сумленьню, | Soll dem ängstlichen Gewissen |
| Крэс кладуць твайму цярпеньню | Ein bequemes Ruhekissen |
| Мір даюць душы, спакой. | Und der Seelen Ruhstatt sein. |
| *Сьпі у міры, зь мірам сьпі!* | *Ruhe sanfte, sanfte ruh'!* |
| У любві сьветлы дух свой супакой! | Höchst vergnügt schlummern da die Augen ein. |
| Душа малітвы... | Wir setzen uns... |